Новая Эўропа

№17 21 января 2010

Журнал «Новая Эўропа» — сетевое издание о политике, обществе, культуре

03
Новости

07
Нефть
Нефтяной конфликт как «рецидив болезни»

10
Климат
Сломанная «клюшка»

13
Болонский процесс
Кваліфікацыя замест адукацыі

16
Театр
«Свободное плавание» белорусского театра



04

# Диалог с разными взглядами

Интервью с членом комиссии по правам человека Европарламента **Кристийной Оюланд**

© Новая Эўропа / www.n-europe.eu
E-mail редакции: ne@n-europe.eu
ISSN 2072-487X

© Офис за демократическую Беларусь
www.democraticbelarus.eu

Office for a Democratic Belarus Brussels

# Кваліфікацыя замест адукацыі

**Краіны Еўразвязу распрацоўваюць сістэму, пры якой вышэйшая адукацыя чалавека будзе ацэньвацца не толькі за веды, але і практычныя ўменні і нават вартасці**

**Калі чалавек прафесіянал, крыніца ягонай адукацыі не мае быць падставай для яе афіцыйнага прызнання — лічаць еўрапейскія адукацыйныя эксперты. А магчымасць прызнання вынікаў нефармальнай адукацыі можа заахвоціць вялікую колькасць дарослых ужо людзей да атрымання вышэйшай адукацыі. Гэта цалкам адпавядае канцэпцыі адукацыі цягам жыцця, якая актыўна ўкараняецца ў Еўропе.**

**Наталля Арцёменка**

**ЖЫЦЦЁВЫ ДОСВЕД VS. ЛЕКЦЫЯ**

Прозвішчы паспяховых вучняў Івана Карпава, кіраўніка і старэйшага трэнера гомельскага гарадскога моладзевага грамадскага аб'яднання баявых мастацтваў, можна называць доўга. Сярод іх не толькі пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных турніраў, але і чэмпіёны Беларусі і нават Еўропы.

«У мяне няма вышэйшай адукацыі, — кажа Іван. — А сваю кваліфікацыю я атрымліваў падчас практыкаванняў. Той досвед, які я атрымаў у сваёй спартовай кар'еры, я лічу самай сур'ёзнай адукацыяй. Ад аднаго са сваіх трэнераў — заслужанага трэнера Рэспублікі Беларусь па боксе Віктара Баранава — я ў свой час узяў вельмі шмат. У прынцыпе, я дагэтуль у яго вучуся, праз ягоныя кнігі па падрыхтоўцы баксёраў.

У той жа час у адной залі са мной працуюць трэнеры, якія маюць вышэйшую адукацыю. Але на сённяшні дзень яны не маюць сур'ёзных вынікаў. Максімум, чаго дасягнулі іх вучні, — сталі прызёрамі рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод юнакоў.

Дыплом пра вышэйшую адукацыю мне б зусім не зашкодзіў. Але я дакладна ведаю, што нічога новага ў сваёй галіне я ва ўніверсітэце не вывучыў бы. А шмат з чым з таго, што там выкладаюць, я мог бы і паспрачацца. Напрыклад з некаторымі методыкамі падрыхтоўкі, з якімі я не згодны. Шмат праз якія з іх я сам прайшоў і адчуў іх эфект на сабе ў працэсе адукацыі і трэніровак. У мяне было чатыры трэнеры. Але толькі адзін з іх стаў сапраўдным настаўнікам. Менавіта ягоны стыль я ўзяў за аснову сваёй трэнерскай працы, дадаў сваё і атрымалася даволі добрая методыка, я б так сказаў, па падрыхтоўцы чэмпіёнаў.

Цяпер для мяне атрымліваць вышэйшую адукацыю цягам пяці гадоў проста не мае сэнсу. І ў мяне не столькі часу, каб вывучаць тое, што я выдатна ведаю і выкарыстоўваю ў маёй працы. Іншая справа — калі б я мог залічыць мае кваліфікацыі, якія я відавочна маю, мяркуючы па выніках маіх вучняў.

**Ў ФРАНЦЫІ КОЖНЫ, ХТО МАЕ ДОСВЕД ПРАЦЫ Ў СФЕРЫ ІНЖЫНЕРЫІ, МОЖА ПАДАЦЬ ДАКУМЕНТЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНУЮ КАМІСІЮ, ЯКАЯ ВЫДАЕ СЕРТЫФІКАТЫ, ШТО ПАЦВЯРДЖАЮЦЬ ТОЙ ЦІ ІНШЫ ЎЗРОВЕНЬ ІНЖЫНЕРНЫХ КВАЛІФІКАЦЫЯЎ"**





ФОТА: XYTUS.COM

Мне трэба было б пазнаёміцца толькі з агульнымі прадметамі, якія выкладаюць ва універсітэце. І думаю, што для гэтага дастаткова было б года, можа быць трошкі больш.

На маю думку, існуе пэўная несправядлівасць. Калі б ад мяне залежала працэдура прызнання дыпломаў аб вышэйшай адукацыі, я б абавязкова ўлічваў вынікі працы. Бо далёка не кожны трэнер можа падрыхтаваць чэмпіёна свету або чэмпіёна Еўропы. А калі падрыхтаваў — значыць ён нешта ў гэтым разумее».

**АДУКАЦЫЯ МУСІЦЬ ВЫМЯРАЦЦА НЕ ТЫМ, КОЛЬКІ ЗАНЯТКАЎ НАВЕДАЎ СТУДЭНТ, АЛЕ ТЫМ, ЧАМУ ЁН НАВУЧЫЎСЯ ”**

### ВЫНІКІ ЗАМЕСТ НАВЕДВАННЯ

Адукацыйныя эксперты краін-удзельніц Балонскага працэсу, а таксама краін-суседак Еўрасаюзу ўжо цяпер працуюць над вырашэннем праблемы прызнання кваліфікацый, набытых па-за фармальнай адукацыйнай сферай.

Ідэя таго, як гэта зрабіць, палягае на перакананні, што ўся адукацыя, у тым ліку вышэйшая, мусіць вымярацца не тым, колькі заняткаў наведаў студэнт, але тым, чаму ён навучыўся. Пры чым ацэньвацца маюць не толькі веды, але і практычныя ўменні і нават вартасці. Гэта значыць, што ўсе праграмы будуць складзеныя такім чынам, каб чалавек атрымаў патрэбныя для сваёй спецыяльнасці веды ды ўмеў ужываць іх на практыцы, эфектыўна працаваць самастойна і ў групе, а таксама, каб умеў ацаніць з розных поглядаў вынік сваіх дзеянняў і рашэнняў. Пры гэтым кожная універсітэцкая праграма будзе расісаная не толькі як спіс прадметаў, але і як спіс ведаў і ўменняў, якімі маюць валодаць студэнты па яе заканчэнні.




Пры такой сістэме будзе значна прасцей прызнаваць частку кваліфікацый, якія чалавек набыў па-за універсітэцкімі сценамі. Дастаткова будзе проста ацаніць ягоныя веды і ўменні. І тады прадметы, якія вядуць да іх атрымання, ён можа не наведваць. Адпаведна доўжыцца адукацыя будзе значна меней, чым для тых, хто «пачне з нуля».

Але і гэта яшчэ не ўсё. Залічыць як частку вышэйшай адукацыі можна будзе не толькі «адукацыю з жыцця», але і, напрыклад, кваліфікацыі, набытыя ва ўстановах прафесійнай сярэдняй адукацыі, на курсах і г. д.

Пакуль большасць еўрапейскіх краін толькі распрацоўвае такую сістэму, яна ўжо даволі паспяхова працуе ў некаторых краінах. Напрыклад, у Шатландыі, дзе кожны чалавек можа падаць дакументы ў спецыяльную камісію ВНУ, каб яна разгледзела набытыя ім ці ёй кваліфікацыі і на падставе гэтага прапанавала скарочаны курс вышэйшай адукацыі. Зразумела, што людзі абіраюць звычайна універсітэт і праграму, вынікі адукацыі якой максімальна перакрыжоўваюцца з тымі ведамі і ўменнямі, якія яны ўжо маюць.

А ў Францыі кожны, хто мае любую адукацыю і/або досвед працы ў сферы інжынерыі, можа падаць дакументы ў спецыяльную незалежную камісію, якая выдае сертыфікаты, што пацвярджаюць той ці іншы ўзровень інжынерных кваліфікацый.

## АД «ПРАЦОЎНАГА ГРАМАДСТВА» ДА «ГРАМАДСТВА, ЯКОЕ ВУЧЫЦЦА»

У Еўропе існуе ўжо трывалае разуменне таго, што адукацыя — гэта галоўны чыннік развіцця і поспеху сучаснага грамадства і эканомікі. Акрамя гэтага, у Еўропе разумеюць, што сёння ўжо не дастаткова атрымання адукацыі раз і назаўжды. Вельмі важнай становіцца цяпер рэалізацыя канцэпцыі адукацыі цягам усяго жыцця (lifelong learning), калі людзі актыўна займаюцца самаадукацыяй, атрымліваюць дадатковыя ці паглыбляюць набытыя раней кваліфікацыі ў разнастайных адукацыйных установах. Істотным элементам рэалізацыі гэтай канцэпцыі ёсць заахвочванне і стварэнне ўмоваў дарослым і працоўным людзям для атрымання вышэйшай адукацыі. Менавіта гэта павінна станоўча паўплываць на развіццё еўрапейскіх краін, а таксама даць кожнаму шанец на паўнавартасны ўдзел у жыцці грамадства.

Сярод іншых паказчыкаў у сферы адукацыі, якіх Еўропа хоча дасягнуць у 2020 годзе, істотнае месца займаюць два наступныя: прынамсі 40 % людзей у веку 30–34 гадоў мусяць мець вышэйшую адукацыю (лічыцца тут і адукацыя на ўзроўні бакалаўра), і прынамсі 15 % дарослых у веку 25–64 гадоў павінны ўдзельнічаць у адукацыі цягам усяго жыцця.

Магчымасць атрымліваць вышэйшую адукацыю па скарочанай індывідуальнай праграме для людзей, што маюць досвед працы ці іншы досвед, — гэта яшчэ і дадатковы стымул для іх працягваць вучыцца і атрымліваць вышэйшы ўзровень не толькі прафесійнай, але і агульнай адукацыі.

На думку прафесара з Універсітэта Жэневы Пірэ Дамінік, які шмат гадоў займаецца распрацоўкай і рэалізацыяй універсітэцкіх праграм адукацыі для дарослых, вельмі важным элементам ёсць не толькі адукацыя, якая рыхтуе да прафесійнай дзейнасці, але і тая, што рыхтуе да эфектыўнага ўкладання ўласнага дарослага жыцця. Асабліва актуальным гэтае пытанне выглядае цяпер, бо свет навокал змяняецца вельмі хутка. Прычым не толькі тэхнічна ці арганізацыйна — змяняецца стаўленне да пэўных каштоўнасцей, напрыклад маральных ці этычных. Таму важна прыцягваць як мага больш дарослых людзей да атрымання вышэйшай адукацыі. Гэта не толькі дазваляе ім больш упэўнена адчуваць сябе на рынку працы, але і засяродзіць увагу на важных жыццёвых пытаннях, напрыклад, падчас дыскусій на такіх прадметах як этыка.

Нават пасля такога кароткага погляду на сітуацыю ў адукацыі перастае быць дзіўным тое, што адзінай краінай-суседкай Еўрасаюзу, якая ігнаруе еўрапейскія адукацыйныя ініцыятывы, застаецца Беларусь. І так мы на ўласны выбар губляем каштоўныя гады развіцця грамадства, нацыянальнай эканомікі, асобаў. НЭ


© Офис за демократическую Беларусь / www.democraticbelarus.eu